**3/482**
*(23.09.2002)*

# Мемарандум аб супрацоўніцтве паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА)

*Уступіў у сілу 10 ліпеня 2002 года*

1. З нагоды афіцыйнага візіту Генеральнага дырэктара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА) Каіціра Мацууры ў Рэспубліку Беларусь 8–10 ліпеня 2002 г. былі праведзены абмеркаванні паміж Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Аляксандрам Лукашэнкам, афіцыйнымі асобамі высокага ўзроўню Беларусі ў галінах адукацыі, навукі, культуры і камунікацыі і Генеральным дырэктарам па пытаннях супрацоўніцтва паміж Беларуссю і ЮНЕСКА.

2. Урад Рэспублікі Беларусь выказаў глыбокае задавальненне існуючым супрацоўніцтвам паміж Беларуссю і ЮНЕСКА і пацвердзіў прыхільнасць Беларусі ідэалам і мэтам гэтай Арганізацыі, выкладзеным у Статуце ЮНЕСКА і Сярэднетэрміновай стратэгіі на 2002–2007 гг.

3. Урад Рэспублікі Беларусь ухваляе палітыку дэцэнтралізацыі Генеральнага дырэктара ЮНЕСКА, што скіравана на набліжэнне ЮНЕСКА да дзяржаў-членаў і прыводзіць да павелічэння дзейнасці па праектах. У сувязі з гэтым Урад Беларусі жадае ўмацоўваць сувязі з Бюро ЮНЕСКА ў Маскве ў рамках рэгіянальных праектаў.

4. ЮНЕСКА будзе аказваць максімальна магчымую падтрымку Беларусі ў распрацоўцы і прымяненні шматдысцыплінарных стратэгій, скіраваных на ўстойлівае развіццё.

5. Абодва Бакі выказалі задаволенасць супрацоўніцтвам, якое ажыццяўляецца, і выказалі жаданне і надалей пашыраць і ўмацоўваць існуючае супрацоўніцтва паміж Беларуссю і ЮНЕСКА ў галіне адукацыі, навукі, культуры і камунікацыі па наступных напрамках.

Адукацыя

У рамках нацыянальнага плана дзеянняў Беларусі па «Адукацыі для ўсіх» распрацоўка стратэгій, накіраваных на забеспячэнне здароўя дзяцей у школе, далейшае паляпшэнне якасці адукацыі і гарантаванне роўнага доступу да адукацыі, у прыватнасці, да вышэйшай адукацыі.

Асаблівыя адукацыйныя патрэбы ў раёнах, забруджаных у выніку выбуху на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі ў 1986 годзе, пры распрацоўцы і ажыццяўленні комплекснай стратэгіі ўстойлівага развіцця Палескага рэгіёна.

Спрыянне дзейнасці, звязанай з Сеткай кафедр ЮНЕСКА, а таксама Сеткай асацыіраваных школ ЮНЕСКА.

Умацаванне супрацоўніцтва беларускіх устаноў і экспертаў у галіне адукацыі з такімі спецыялізаванымі ўстановамі ЮНЕСКА, як Міжнароднае бюро асветы (МБА, Жэнева), Міжнародны інстытут планавання адукацыі (МІПА, Парыж), Інстытут інфармацыйных тэхналогій у адукацыі (ІІТА, Масква), Інстытут адукацыі ЮНЕСКА (ІАЮ, Гамбург), Еўрапейскі цэнтр вышэйшай адукацыі (СЕПЕС, Бухарэст) і Цэнтр ЮНЕСКА па прафесійна-тэхнічнай адукацыі (ЮНЕСКА-ЮНЕВОК, Бон).

Навука

Распрацоўка і ажыццяўленне канцэпцыі комплекснай стратэгіі дзеля забеспячэння ўстойлівага развіцця Палескага рэгіёну праз умацаванне супрацоўніцтва з такімі навуковымі праграмамі ЮНЕСКА, як Чалавек і біясфера (МАБ), Міжнародная гідралагічная праграма (МГП), Міжнародная праграма сацыяльных пераўтварэнняў (МОСТ), Міжнародная праграма геалагічнай карэляцыі (МПГК), у цесным супрацоўніцтве з іншымі адпаведнымі міжнароднымі арганізацыямі і іншымі партнёрамі, з улікам вынікаў Сусветнай сустрэчы на вышэйшым узроўні па ўстойліваму развіццю, якая мае адбыцца ў верасні 2002 г. у г.Іаганесбургу, Паўднёвая Афрыка.

Далучэнне да Еўрапейскай сеткі біясферных запаведнікаў і стварэнне трансгранічнага біясфернага запаведніка з наданнем асаблівай увагі развіццю экалагічнага турызму і садзейнічанне ўстойліваму эканамічнаму развіццю.

Тэхнічная падтрымка даследчай дзейнасці і падрыхтоўкі кадраў у галіне ўстойлівага выкарыстання водных рэсурсаў і абыходжання з імі, у тым ліку ў Палескім рэгіёне.

Культура

Распрацоўка канцэпцыі развіцця культурнага турызму і забеспячэнне ўстойлівага сацыяльнага і эканамічнага развіцця мясцовай абшчыны на базе «Замкавага комплексу Мір», унесенага ў Спіс сусветнай спадчыны ў 2000 г.

Вызначэнне патэнцыяльных прыродных, культурных мясцін і культурных ландшафтаў для ўключэння ў Папярэдні спіс па Беларусі.

Спрыянне дзейнасці па вуснай і нематэрыяльнай культурнай спадчыне, у прыватнасці, па Палескаму рэгіёну.

Камунікацыя і інфармацыя

Развіццё нацыянальнай інфармацыйнай палітыкі і патэнцыялу людскіх рэсурсаў у адпаведнасці з векам інфармацыі ў рамках Праграмы ЮНЕСКА «Інфармацыя для ўсіх».

У рамках Праграмы «Памяць свету» – захаванне ў лічбавай форме і доступ да дакументальнай спадчыны; садзейнічанне рэгіянальнаму супрацоўніцтву дзеля палягчэння доступу да рэгіянальных архіваў, бібліятэк і іншых месцаў захавання дакументальнай спадчыны як для беларускіх экспертаў, так і для экспертаў рэгіёну, падтрымка і развіццё кантактаў з адпаведнымі зацікаўленымі рэгіянальнымі ўстановамі.

6. Генеральны дырэктар запэўніў Урад Беларусі, што належным чынам прыняў да ведама пералічаныя вышэй накірункі.

Здзейснена ў Мінску 10 ліпеня 2002 года ў чатырох арыгінальных экзэмплярах, два з якіх на беларускай і два на англійскай мовах.